# ПРАДМОВА

Слоўнік «Раслінны свет» з'яўляецца працягам серыі слоўнікаў, аб'яднаных пад агульнай назвай «Беларуская народная тэрміналогія і наменклатура» (апублікаваны першы выпуск серыі «Жывёльны свет». Мн., 1999). Тэматычны слоўнік «Раслінны свет» уключае мясцовыя назвы раслін і грыбоў і лексіку, звязаную з іх жыццядзейнасцю. Як і папярэдні слоўнік, ён складаецца з дзвюх частак. У першай прыводзяцца назвы прадстаўнікоў расліннага свету, у другой — назвы груп раслін і словы, якія абазначаюць паняцці аб іх частках, жыццядзейнасці, якасцях, уласцівасцях і інш., у канцы кнігі — алфавітны паказальнік прыведзеных слоў. У першай частцы слоўніка падаюцца назвы толькі тых раслін, якія характарызуюцца разнастайнасцю назваў у гаворках.

Лексічны матэрыял у абедзвюх частках слоўніка прыведзены па тэмах. У аснову яго тэматычнай класіфікацыі пакладзены пашыраныя народныя традыцыйныя ўяўленні аб групоўцы паняццяў, звязаных з падзелам раслін, іх будовай, асаблівасцямі існавання, уласцівасцямі і якасцямі.

Аўтарская работа выканана наступным чынам: «Лясныя, садовыя і паркавыя дрэвы» — Ф. Д. Клімчук, «Дзікія і культурныя кустарнікі» — Ф. Д. Клімчук, «Лугавыя і палявыя травяністыя расліны» — Л. П. Кунцэвіч (А — К), В. М. Курцова (Л — Я), «Лясныя травяністыя расліны» — А. А. Крывіцкі, «Водныя і балотныя травяністыя расліны» — В. Дз. Астрэйка, «Сельскагаспадарчыя травяністыя расліны» — М. А. Ісачанкава, «Кветкавыя агародныя і пакаёвыя расліны» — М. А. Ісачанкава, «Назвы грыбоў» —

Т. М. Трухан, «Тэматычныя групы лексікі са значэннем характарыстыкі раслін і грыбоў» — А. І. Шаблоўскі (падраздзелы 3.1—3.3 падрыхтаваны сумесна з В. Дз. Астрэйка і Ф. Д. Клімчуком).

Мясцовыя словы ўпарадкаваны ў слоўнікавых артыкулах з улікам галоўным чынам іх пашырэння ў мясцовых гаворках. Паметы аб пашырэнні з'яўляюцца абагульненымі, арыентацыйнымі. Побач падаецца крыніца фіксацыі мясцовага слова.

Слоўнік з'яўляецца даведнікам аб беларускай мясцовай лексіцы, звязанай з раслінамі, не толькі для філолагаў, але і для батанікаў, этнографаў і ўсіх аматараў роднага слова.